# „Песьня вайны“

1. Перад Маладой поэзіяй пасьлякастрычнікаўскага кругабегу рэволюцыя паставіла была задачу — стварыць вобраз вялікасьці эпохі, узьнятасьці працоўных мас, словам, стварыць поэтычныя портрэты сучаснасьці, портрэт рэволюцыі. Гэта была асноўнай умовай самой поэзіі. Поэзія павінна была адказваць гэтай умове, каб быць поэзіяй. Поэзія павінна была стварыць вобраз рэволюцыі. Па тым, як гэта рабілі асобныя яе прадстаўнікі, чытацтва пазнавала, якая гэта поэзія[1]. І поэты, як хто ўмеў, — адны горш, другія лепш — тварылі поэзію рэволюцыі. П[ушча] ня мог, канечне, выскачыць з свае эпохі. Ён таксама мусіў падпарадкаваць сваю творчасьць умовам рэв[олюцыі]. Ён творыць таксама вобраз рэволюцыі, але творыць яго па–свойму, творыць яго такім, якім ён яго перажыў. Гэтым і ёсьць „Песьня вайны“.

2. Месца „П[есьні] в[айны]“ у бел[арускай] поэзіі вызначаецца характарам тае поэзіі, якую яна прадстаўляе. Перадусім гэта поэзія асобага роду. Гэта род поэзіі **інтымнай**. Інтымнай у сэнсе асноўнае свае накіраванасьці. На самай справе „П[есьня] в[айны]“ зьяўляе сабою расказ песьняр[а]–лірніка („я“) у кругу сваіх сяброў пра падзеі мінулага, расказ памінальны, расказ бяседны, у якім раскрываецца гісторыя поэта. У гэтым родзе яна паказвае, да якой выш[ыні] дайшла поэзія бел[аруская] пасьля рэволюцыі. Па маст[ацкай] культуры — гэта поэзія, што станові[ць] пачатак новай маст[ацкай] культуры, асноўнай адзнакай якое ёсьць уяўленьне як констр[укцыйны] прынцып поэзіі. Гэта поэзія **складанай** мотывацыі. Прык[лад] — расказ „я“ пра мінулае і ў гэтым расказе расказ Іскр[ыніча] пра свае перажыв[аньні] вайны, гісторыя яго перажыв[аньняў], як яны адлюстраваліся ў яго сьвядомасьці (праўдз[івыя] уяўленьні). „Я“ расказвае пра падзеі вайны як пра тое, на фоне чаго адбылося выйсьце Марыі з вёскі ў горад, праўдзівей, не расказвае, а **прадстаўляе** ў словах, у слоў сугучных граньні. І ў гэтым прадстаўлень[ні] прыводзіць расказ поэты аб сваіх перажываньнях (спатканьне з Марыяй у горадзе і прысьвяч[эньне] ёй песень). Т[акім] ч[ынам] аўтар як–бы пераносіць з сябе адказн[асьць] за песьні на ўяву, ён об'ектывізуе сваю адказнасьць за песьні ў поэта. Іскрыні[чам] мотывуец[ца] такі, а ня іншы характар Песьні песень. Расказ–жа Іскр[ыніча] — гэта ілюст[рацыя] таго, як робіцца рэвол[юцыя] у пачуцьцях чалав[ека] (поэты) пад уплыв[ам] Марыі. Марыя для Іскр[ыніча] — гэта рэволюцыя ў яго пачуц[ьцях], яго сьвядомасьці. Т[акім] ч[ынам], і тут адказнасьць за пералом у пач[уцьцях] Іскр[ыніча] об'ектывізавана ў Марыю. Як Іскр[ынічам] мотываван[ы] харак[тар] Песьні песень, так Марыяй мот[ываваны] пераварот у пач[уцьцях] і сьвядом[асьці] Іскрыніча. Тады {[(Іскр[ыніч] як воін імп[эрыі] і як поэт) — Марыя] — „я“}. Марыя мотывавана падзеямі мінулага (у вайне дзьвёх імпэрый зьявілася Марыя). Так што зноў такі адказнасьць за Марыю об'ект[ывізавана] у падзеі мінулага. Самі–ж падзеі мотывуюцца апавяданьнем „я“ ў кругу сваіх сяброў як пытаньнем, як павінны „мы“ паставіц[ца] да М[арыі] сёньня. А чым „я“ мотывуецца? Яго мотывацыя ў аўтаравым уяўленьні. *[рукапіс абрываецца]*

*[1928]*

[1] Па тым, як тварылі, чытацтва пазнавала, хто такія поэты і што ў іх за поэзія.